**Альтшулер, А.** Апошні бой Косці Шабанава / А. Альтшулер // Віцебскі рабочы. – 1985. – 31 студз. – С. 3.

## АПОШНІ БОЙ КОСЦІ ШАБАНАВА

Было гэта ў жніўні 1943 года. У цяжкім становішчы апынуліся атрады Машкова і Пагарэлава з 1-й Беларускай партызанскай брыгады, якія дзейнічалі на правым беразе Заходняй Дзвіны паблізу вёскі Буева. Для іх знішчэння з Віцебска прыбыў полк мотапяхоты праціўніка. Разам з карнікамі мясцовых гарнізонаў полк блакіраваў Падзвінскую пушчу, няспынна сціскаючы кальцо акружэння. Партызаны занялі кругавую абарону і паспяхова адбівалі шматлікія атакі праціўніка, які наступаў з усіх бакоў. Але і самі неслі значныя страты. У абодвух атрадах былі на зыходзе боепрыпасы. Выхад адзін – ісці на прарыў.

У баях па прарыву варожай блакады народныя мсціўцы праявілі гераізм. Неўміручы подзвіг здзейсніў тады памочнік камісара атрада Машкова па камсамолу Косця Шабанаў, які ўзначаліў кулямётны разлік. У самы крытычны момант бою, калі праціўнік пачаў асабліва моцна цясніць партызан, Косця са сваім разлікам зайшоў у тыл і адкрыў трапны агонь па праціўніку.

У час рашаючага штурму Косця Шабанаў атакаваў ворага з флангу, прыняўшы на сябе галоўны ўдар. Карнікі пераключылі на яго асноўны агонь. Юнак быў паранены ў абедзве нагі, але працягваў страляць. Байцам разліку ён загадаў адысці да асноўных сіл атрада, а сам вёў інтэнсіўны агонь, пакуль у дысках не скончыліся патроны. Кулямёт Шабанава змоўк. Фашысты кінуліся да бясстрашнага кулямётчыка, каб захапіць яго жывым. Косця крыкнуў:

— Бывайце, таварышы. Памятайце Косцю! Біце гадаў, як я іх біў! – З гэтымі словамі ён вырваў чэку з гранаты. Грымнуў выбух. Косця загінуў, знішчыўшы яшчэ некалькі карнікаў.

А ў гэты момант байцы двух атрадаў з крыкамі «ўра!» кінуліся ў атаку, прарвалі варожае акружэнне і выйшлі на шасэ Віцебск – Сураж каля вёскі Манулкі.

**А. АЛЬТШУЛЕР**